Парадак абскарджання адміністрацыйных рашэнняў
Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2008 года "Аб асновах адміністрацыйных працэдур"

Артыкул 30. Парадак абскарджання адміністрацыйнага рашэння

1. Зацікаўленая асоба і трэцяя асоба валодаюць правам на абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку.

2. Адміністрацыйная скарга накіроўваецца ў вышэйстаячы дзяржаўны орган (вышэйшую арганізацыю) або ў дзяржаўны орган, іншую арганізацыю, да кампетэнцыі якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі і пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь адносіцца разгляд такіх скарг (далей - орган, які разглядае скаргу).

3. Абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў судовым парадку ажыццяўляецца пасля абскарджання такога рашэння ў адміністрацыйным (пазысудовым) парадку, калі іншы парадак абскарджання не прадугледжаны заканадаўчымі актамі.

У выпадку адсутнасці органа, які разглядае скаргу, адміністрацыйнае рашэнне ўпаўнаважанага органа можа быць абскарджана непасрэдна ў суд.

Абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў судовым парадку ажыццяўляецца ў адпаведнасці з грамадзянскім працэсуальным або гаспадарчым працэсуальным заканадаўствам.

У адпаведнасці з артыкулам 225 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і адмова ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў і выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану можа быць абскарджаны ў суд.

Парадак падачы і разгляду такіх скарг вызначаны артыкуламі 348-350 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з артыкулам 355 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь такая скарга можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін, які вылічаецца з дня атрымання грамадзянінам адмовы органа загса ў задавальненні яго заявы.